30 сакавіка 1969 г. № 63 [4727]

## ...таронка ...акцыйнай ...шты

У Анусінскай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна каля 10 тысяч кніг. Цяпер бібліятэка праводзіць вялікую работу, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Тут чытаюцца лекцыі, арганізуюцца дыспуты, вечары. Значную дапамогу загадчыцы бібліятэкі Веры Рыгораўне Андрэевай аказвае камсамолка Валянціна Харламава. Дзяўчына загадвае адной з перасовак. Акрамя таго, яна актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці калгаса імя Леніна, член калектыву фізкультуры, дэпутат мясцовага сельскага Савета. Валя вучыцца ў сельскагаспадарчым тэхнікуме.

*НА ЗДЫМКУ: Валянціна ХАРЛАМАВА (злева) і Вера Рыгораўна АНДРЭЕВА.*

Фота **М. Буглака.**




*ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МІНСКАЯ ПРАЎДЫ»*

## «СПЫНІЦЕ БЯДУ!»

Пад такім загалоўкам у нумары нашай газеты за 21 лютага было змешчана пісьмо жыхароў в. Новыя Пышагі Крупскага раёна, у якім яны пісалі аб тым, што іх аднавясковец І. І. Паўлініч штодзень п'янствуе, учыняе дэбошы дома і на вуліцы. А ў яго шасцёра малалетніх дзяцей.

Як паведаміў нам начальнік аддзела ўнутраных спраў Крупскага райвыканкома т. Будзейка, па выступленню газеты праведзена праверка. Факты, прыведзеныя ў пісьме, мелі месца. Праўда, у апошні час І. І. Паўлініч перагледзеў свае паводзіны — не п'е, наладзіў адносіны ў сям'і. Таму падстаў для прыцягнення яго да крымінальнай адказнасці няма. Аддзел унутраных спраў будзе пастаянна цікавіцца паводзінамі І. І. Паўлініча.

Акрамя таго, у пісьме прыводзіліся факты парушэнняў правіл гандлю алкагольнымі напіткамі ў магазінах в. Пышагі і Свірыдаўка. На жаль, ад Крупскага райспажыўсаюза мы адказу пакуль што не атрымалі.

# ...АРОГА ДА ЛЮДЗЕЙ